Ігуменскі тракт
№ 8 (206)



■ Брэнд краіны

# МЕСЦЫ СІЛЫ НА ВАЛОЖЫНШЧЫНЕ

## Сон на вуллях, водары хатняй кулінарыі і іншыя цікавінкі для вандроўнікаў

**Прыемна, што ў нашай краіне актыўна развіваецца турызм, а з асаблівай паспяховасцю — аграэкатурызм. І адзін з лідараў у гэтым сэнсе — Валожынскі рэгіён. У 2009 годзе тут з'явіўся лакальны брэнд — зялёны маршрут «Валожынскія гасцінцы» — была прыдумана арыгінальная, цэльная канцэпцыя. Ужо ў 2012-2013 гадах запрацаваў размечаны і добраўпарадкаваны веламаршрут «Валожынскія гасцінцы». І калі першапачаткова яго даўжыня складала 150 кіламетраў, то цяпер гэта ўжо каля 300 кіламетраў! З 2016 года Валожынскім райвыканкамам зарэгістраваны спажывецкі кааператыў па развіцці аграэкатурызму. Аналагічных структур у нашай краіне пакуль больш няма. Яго мэта — аб'ядноўваць людзей вакол рэгіянальнага брэнда.**

Такім чынам, праект «Валожынскія гасцінцы» досыць насычаны. Ён ахоплівае як аграсядзібы, так і рамеснікаў, пчаляроў, фермераў і многіх іншых апантаных спецыялістаў і аматараў. Калі звярнуцца да мовы лічбаў, то ў межах кааператыва прадстаўлены кантактны заапарк, распрацавана і праводзіцца пяць экскурсій, пяць конных маршрутаў, восем водных маршрутаў, можна набыць на любы густ восем асартыментных груп прадукцыі — мядовую, хлеб і хлебабулачныя вырабы, розныя сувеніры — тут праводзіцца 10 майстар-класаў. Усяго ж у кааператыў уваходзяць 15 аграсядзіб і фермерскіх гаспадарак.

**Сон з пчоламі аднаўляе сілы і энергію лепш, чым начны 8-гадзінны сон.**

Дзякуючы больш чым 12 000 еўра, выдзеленых на ініцыятыву «Развіццё інфраструктуры зялёнага маршруту «Валожынскія гасцінцы» ў Валожынскім раёне», які рэалізуецца спажывецкім кааператывам па развіцці аграэкатурызму «Валожынскія гасцінцы», за апошні час у раёне з'явілася некалькі знакавых аб'ектаў. Усё гэта адбываецца ў межах праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Беларусі», што фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН). Думаецца, тым цікавінкам, якія адна за адной з'явіліся на Валожыншчыне, многія маглі б пазайздросціць!

Так, у сядзібе «Марцінова Гусь» у вёсцы Малая Люцінка, што на Валожыншчыне, адкрылася міні-пякарня, дзе цяпер можна пакаштаваць старадаўнія беларускія прысмакі. Побач з пякарняй працуе і «Аптэчка прыемная», дзе ўладкавана музейна-лекцыйнае памяшканне для дэгустацый і лекцый. Там плануюць расказваць пра даўнюю культуру хлебапячэння і выкарыстання традыцыйных для нашай краіны араматычных раслін у розных аспектах паўсядзённага жыцця — у выпечцы, у хатняй парфумерыі, у народнай медыцыне, у прыгатаванні напояў. «Звязда» ужо пісала і пра пляцоўку для бёрдвотчынгу, якая з'явілася на беразе Сакаўшчынскага вадасховішча. Яна знаходзіцца побач з сядзібай «За масточкам»,



У беларускай традыцыйнай выпечцы часам выкарыстоўвалі духмяныя расліны.

што ў вёсцы Замасцыны. На пляцоўцы ў спакойнай абстаноўцы, скарыстаўшыся спецыяльным абсталяваннем, можна station назіраць за птушкамі, у тым ліку за самымі рэдкімі відамі — лебедзем-клікуном і шызай чайкай. Карэспандэнту «Звязды» было надзвычай цікава наведаць і музей коннага пасажырскага і гужавога транспарту, што з'явіўся ў вёсцы Белакорац на ўскрайку Налібоцкай пушчы. Адметна, што гэта далёка не ўсё, чым можа здзівіць Валожыншчына!..

Асабліва прывабнай для турыстаў стала і творчая майстэрня «Іслач» у мястэчку Ракаў. На іх узбраенні з'явіліся лазерны гравёр і свідравальны станок для шкла. Крыху іншы, абноўлены выгляд набыў і сам будынак майстэрні, і тэрыторыя вакол яго.

У гэтым адметным кутку турысты змогуць азнаёміцца з экспазіцыяй посуду эпохі Радзівілаў, з тэхналогіяй нанясення гравіроўкі на яе. Можна нават паспрабаваць нанесці пэўны ўзор ці надпіс сваімі рукамі. Інтэрактыўныя майстар-класы гравіроўкі па шкле — адзін з прыёмаў крэатыўнай эканомікі, які выкарыстоўвае ўладальнік майстэрні Васіль Рубцоў.



Келіхі і кубкі, сканструяваныя па ўзорах радзівілаўскіх экспазіцый, гравіраваныя Васілём Рубцовым яшчэ ўручную.

Новае абсталяванне дапамагае прыгожа маркіраваць шкляныя сувеніры (як і многія іншыя) адметнымі эмблемамі, знакамі. Важна, што ў мясцовай падарункавай прадукцыі цяпер з'яўляцца пазнавальныя вобразы.

**У спакойнай абстаноўцы можна station назіраць за птушкамі, у тым ліку за самымі рэдкімі відамі — лебедзем-клікуном і шызай чайкай.**

Адметная цікавінка з'явілася ў вёсцы Міжрэчча, што непадалёк ад Ракава. Там прапануюць «Сон на вуллях». Што ж гэта такое і як можна заснуць побач з пчоламі?.. Аказваецца, не толькі можна, але яшчэ і вельмі карысна для здароўя! Але працуе ўсё, натуральна, па асаблівай тэхналогіі. Пабудаваны драўляны домік, у сцены якога ўбудаваны вуллі, чатыры, з кожнага боку.

Над вуллямі абсталяваныя спальныя месцы — драўляныя ляжанкі, якія маюць трохміліметровыя шчыліны для лепшага паветраабмену з вуллямі. Чалавек кладзецца на ляжанку, часцей за ўсё засынае.

Такі сон з пчоламі аднаўляе сілы і энергію лепш, чым начны 8-гадзінны сон. Для здаровага сну створана сукупнасць станоўчых фактараў: водар воску, мёду, пылку і прапалісу, мікравібрацыі і раўнамернае гудзенне пчол, тэмпература вулля, іанізацыя паветра. Гэты арыгінальны від адпачынку будзе цікавы ўсім, хто вядзе здаровы лад жыцця, імкнецца адпачыць у спакоі пасля насычанага і тлумнага гарадскога жыцця, зарадзіцца энергіяй і сілай прыроды.

Апі-домік размяшчаецца ў экалагічна чыстым раёне з добрымі пад'язнымі шляхамі, навокал знаходзіцца шмат гістарычных і прыродных цікавінак. Таму яго стваральнікі мяркуюць, што дзякуючы яму не толькі да іх, але і на іншыя аб'екты «Валожынскіх гасцінцаў» завітае шмат вандроўнікаў. А тыя, хто ўжо бываў на Валожыншчыне, безумоўна, і так вяртаюцца сюды зноў і зноў. Таму што да добрага прызвычайваешся хутка, тым больш нікога не могуць пакінуць абыякавым месцы са станоўчай, цёплай энергетыкай і надзвычай гасціннымі людзьмі.

*Валожынскі раён*



Наведаць апі-домік у «Мядовай каралеве» можна будзе толькі ў канцы чэрвеня, калі пчаліныя сем'і крыху разрастуцца.

■ Дзеля памяці

# СЫНУ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

## У Марачоўшчыне адкрыты помнік Тадэвушу Касцюшку



Фота БЕЛТА.

**Днямі ва ўрочышчы Марачоўшчына Івацэвіцкага раёна адбылася цырымонія ўрачыстага адкрыцця помніка Тадэвушу Касцюшку. Помнік вайсковаму і палітычнаму дзеячу, устаноўлены на яго малой радзіме, — першы ў Беларусі. Манумент вышынёй 2,2 метра адліты з бронзы. Тадэвуш Касцюшка глядзіць удалечыню, у адной руцэ ён трымае шаблю, другой прыціскае да грудзей капялюш.**

— Тадэвуш Касцюшка ўвайшоў у гісторыю некалькіх дзяржаў. Яго асоба — прыклад адданасці сваёй радзіме, святой любові да роднага краю, — падкрэсліў старшыня Івацэвіцкага райвыканкама Аляксандр Грыцук. — Усё вялікае пачынаецца з малога. З устаноўкі валуна пачалося адраджэнне гэтага месца. Паступова Марачоўшчына ператварылася ў сапраўдны палацава-паркавы комплекс. Хочацца падзякаваць усім неабыякавым людзям, якія ахвяравалі сродкі на стварэнне гэтага манумента.

Помнік гарманічна ўпісаўся ў пейзаж Марачоўшчыны. Ён размяшчаецца на тэрыторыі мемарыяльнага музея-сядзібы Тадэвуша Касцюшкі. Насупраць знаходзіцца Косаўскі палац, які цяпер рэканструюецца, а некалькі яго залаў ужо адкрытыя для наведвання.

— Мясцовыя ўлады заўсёды гатовыя падтрымаць ініцыятывы і праекты, накіраваныя на развіццё малой радзімы, — дадаў старшыня райвыканкама. — І прыкладам тут будзе служыць Марачоўшчына, якая становіцца аб'ектам асаблівай турыстычнай прывабнасці і значнасці.

Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, пісьменнікі, грамадскія дзеячы і, натуральна, мясцовыя жыхары. Да помніка Касцюшкі былі ўскладзены кветкі, грамадскасць наведала музей у яго радавой сядзібе, пабывала ў Косаўскім палацы.

Варта дадаць, што грошы на ўсталяванне помніка былі сабраныя праз ахвяраванні. 690 чалавек сабралі больш за 22 тысячы рублёў. Імёны ўсіх ахвярадаўцаў будуць захоўвацца ў музеі. Помнік адліты ва Украіне паводле праекта беларускага скульптара Гэніка Лойкі.

**Матэрыялы падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**